# СЕМІНАР 3.
## Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917–1941 гг.

### 1. Рэвалюцыі 1917 г. і беларускае пытанне.

Важнейшым з іх для сялянскай краіны з'явілася пытанне аб зямлі. Разбурэнні і страты пад час Першай сусветнай вайны актуалізавалі патрабаванне міру. Народы Расійскай і іншых імперый вайна прымусіла пашырыць сваю барацьбу за сваё існаванне. Не з'яўляліся выключэннем і беларусы.

У лютым 1917 г. адбылася чарговая рэвалюцыя ў Расійскай імперыі, якую гісторыкі называюць Лютаўская рэвалюцыя. У выніку рэвалюцыйных падзеяў 2 сакавіка 1917 г. імператар Мікалай II адрокся ад прастола. Рэвалюцыя перамагла. Было ўсталявана двоеўладдзе.

Прадстаўнікі сацыяльных слаёў і груп па рознаму бачылі шляхі вырашэння акрэсленых пытанняў. З сакавіка па лістапад 1917 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 26 палітычных партый і арганізацый, пераважна агульнарасійскіх. Вялікі ўплыў у гарадах і мястэчках меў Бунд. Актывізаваліся арганізацыі прапольскай, літоўскай і украінскай арыентаванасці. У сакавіку 1917 г. аднавіла сваю дзейнасць Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ). Яе арганізацыі ўзніклі ў Петраградзе, у Маскве, гарадах неакупіраванай часткі Беларусі. БСГ падтрымала Часовы урад у спадзяванні, што ён будзе дзейнічаць з улікам інтарэсаў беларусаў. За перыяд з сакавіка па кастрычнік свае палітычныя партыі стварылі беларускія памешчыкі, буржуазія, духавенства, інтэлігенцыя. Наяўнасць вялікай колькасці салдат, шматэтнічны і поліканфесійны склад насельніцтва Беларусі абумовілі значныя цяжкасці для аб'яднання нацыянальных сіл. Але паступова акрэслівавася разуменне таго, што без кансалідацыі намаганняў дасягнуць поспеху немагчыма.

У чэрвені 1917 г. на канферэнцыі ў Петраградзе быў адобраны праект праграмы-мінімум Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ). Да гэтага часу БСГ уяўляла сабой найбуйнейшую беларускую арганізацыю, якая налічвала каля 5 тыс. чалавек. Сярод бліжэйшых задач пазначаліся нацыяналізацыя прамысловасці, стварэнне кааапeратыўных і крэдытных арганізацый, увядзенне 8-гадзіннага працоўнага дня, устанаўленне мінімальнага заробку інш. Вырашэнне важнейшага для беларусаў пытання аб зямлі бачылася праз перадачу зямлі органам мясцовага самакіравання, якія павінны былі размеркаваць яе паміж сялянамі. Нягледзячы на тое, што БСГ канчатковай мэтай абвясціла «увядзенне сацыялістычнага парадку праз

развіццё класавай барацьбы і сацыяльную рэвалюцыю», яна спадзявалася на вырашэнне усіх актуальных пытанняў на Ўстаноўчым сходзе.

Між тым, Часовы урад не змог вырашыць нават пытанні забеспячэння харчаваннем. Паражэнні на фронце і далейшае абвастрэнне сацыяльных праблем вызвалі наступны палітычны крызіс. 3 - 4 ліпеня ў Петраградзе адбылася масавая несанкцыянаваная дэманстрацыя, якая з дазволу Усерасійскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў была разагнана. Пачаліся арышты бальшавікоў, спачуваўшых ім рабочых і салдат. На фронце ўводзіліся смяротная кара і ваенна-палявыя суды. Такім чынам, двоеўладдзе завяршылася. Бальшавікі ўзялі курс на падрыхтоўку ўзброенага паўстання. Узнікшая сітуацыя вымушала беларускія нацыянальныя сілы да пошуку новых падыходаў.

18 ліпеня Вярхоўным галоўнакамандуючым быў прызначаны генерал Л.Г. Карнілаў, які ў канцы жніўня запатрабаваў усталяваць у краіне ваенную дыктатуру. Па загаду Карнілава ў Петраград былі накіраваны вайсковыя падраздзяленні. А.Ф. Керанскі, які ўзначальваў Часовы ўрад, расцаніў гэта патрабаванне як мяцеж і загадаў Карнілаву скласці паўнамоцтвы галоўнакамандуючага. Генерал адмовіўся. Тады Керанскі звярнуўся за падтрымкай да Петраградскага Савета. Улады выпусцілі з турмаў арыштаваных лідараў бальшавікоў. А.Ф. Керанскі прыняў на сябе кіраўніцтва войскамі. 1 верасня 1917 г. Л.Г. Карнілаў быў арыштаваны.

Актыўны ўдзел у гэтых падзеях прынялі мясцовыя Саветы, якія ўзніклі ў Беларусі ў лютым – сакавіку 1917 г. 30 жніўня быў створаны Часовы рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту. Рэвалюцыйна настроеныя салдаты і рабочыя ўсталявалі кантроль над стратэгічнымі чыгуначнымі станцыямі, арсеналамі.

Бальшавікі, якія ўзначалілі барацьбу супраць акцыі генерала Карнілава, значна павысілі свой аўтарытэт сярод рэвалюцыйна настроенай часткі насельніцтва. У верасні 1917 г. у ходзе перавыбараў саветаў яны атрымалі большасць у Мінскім савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Вядучыя палітычныя сілы Расіі спрабавалі знайсці выхад з крызісу. 14 верасня ў Маскве адбылася Дэмакратычная нарада, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі буржуазных, рэвалюцыйна-дэмакратычных партый. Дэлегаты

выказаліся за кааліцыю з кадэтамі і стварэнне новага складу Часовага ўрада. Бальшавікі прапанавалі склікаць ІІ Усерасійскі з’езд саветаў, які павінен быў вырашыць пытанне аб уладзе. Быў сфарміраваны новы кааліцыйны склад Часовага ўрада пад старшынствам А. Керанскага, абвешчана рэспубліка. Аднак аўтарытэт улады быў невысокім. Сістэмны крызіс працягваўся. Часовы ўрад праяўляў эканамічную некампетэнтнасць, што вяло дэмакратычную рэвалюцыю да гібелі, а краіну да катастрофы. Разлік на перамогу ў Першай сусветнай вайне быў памылковым. Сяляне стаміліся чакаць аграрную рэформу. Лютаўская рэвалюцыя выклікала да жыцця магутны нацыянальна-вызваленчы рух, але Часовы ўрад не прапанаваў шляхоў вырашэння нацыянальнага пытання.

Бальшавікі вырашылі скарыстаць сітуацыю, якая склалася ў сталіцы для захопу ўлады. У ноч з 24 на 25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе адбылося ўзброенае паўстанне рабочых і салдат. Увечары 24 кастрычніка атрады Чырвонай гвардыі, некаторыя вайсковыя часці захапілі пошту, тэлеграф, вакзалы, масты. Раніцай была апублікавана адозва Петраградскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, падрыхтаваная У.І. Леніным, у якой абвяшчалася аб звяржэнні Часовага ўрада.

Вечарам 25 кастрычніка 1917 г. адкрыўся ІІ Усерасійскі з’езд саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. З 649 чалавек 390 прадстаўлялі бальшавікоў. Ад Беларусі і салдат Заходняга фронту прысутнічаў 51 дэлегат. Ноччу паўстанцы арыштавалі членаў Часовага ўрада. Меншавікі і правыя эсэры пакінулі з’езд саветаў у знак пратэсту супраць перавароту. З’езд прыняў рашэнне аб пераходзе ўлады да Саветаў. Быў заснаваны Савет народных камісараў як Часовы рабочы і сялянскі ўрад. Яго ўзначаліў Уладзімір Ленін. Былі прыняты Дэкрэт аб зямлі, які адмяняў прыватную ўласнасць на зямлю, Дэкрэт аб міры. У краіне ўсталёўвалася новая ўлада.

Звесткі аб паўстанні ў Петраградзе сталі вядомы ў Мінску 25 кастрычніка ў другой палове дня. Выканкам Мінскага савета вывеў на вуліцы горада салдат двух запасных палкоў, вызваліў з турмы каля 800 арыштаваных. 26 кастрычніка 1917 г. выканкам Мінскага савета абвясціў аб пераходзе ўлады ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. З палітычных зняволеных быў створаны 1-ы рэвалюцыйны полк. Супраць пераходу ўлады саветам выступілі меншавікі, эсэры, бундаўцы, беларускія і яўрэйскія нацыянальна-дэмакратычныя партыі. На пасяджэнні Мінскага савета яны асудзілі ўзброены захоп улады ў Петраградзе.

27 кастрычніка быў створаны Камітэт выратавання рэвалюцыі на чале з Т. Калатухіным. Большасць у ім мелі эсэры, меншавікі і бундаўцы. Камітэт увёў у Мінск часці Каўказскай дывізіі, зняў вайсковыя пасты Мінскага савета, адхіліў прызначаных ім камісараў. Мінскі савет пагадзіўся на перадачу ўлады Камітэту пры ўмове, што войскі не будуць накіроўвацца на падаўленне паўстання ў Петраградзе і Маскве. Пасля заключэння пагаднення бальшавікі правялі агітацыю сярод салдат, дзе яны мелі значную падтрымку. У ноч з 1 на 2 лістапада ў Мінск увайшоў браніраваны цягнік, а таксама атрады рэвалюцыйных салдат, якія ўзялі пад абарону Мінскі савет. У канцы

кастрычніка – пачатку лістапада савецкая ўлада была ўстаноўлена ў Віцебску, Гомелі, Полацку, Оршы і іншых гарадах. Абапіраючыся на ствараемыя пры вайсковых фарміраванннях Ваенна-рэвалюцыйныя камітэты, бальшавікі праводзілі перавыбары Саветаў і забяспечвалі сабе большасць у іх складзе.

У лістападзе 1917 г. адбыліся з'езд саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, III з'езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, II з'езд армій Заходняга фронту. Яны прынялі рашэнне аб стварэнні адзінага органа кіравання. 26 лістапада сфарміраваны Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах, які узначаліў напачатку Мікалай Рагазінскі, а са студзеня 1918 г. – Аляксандр Мяснікоў (Мяснікян)).

## 2. Абвяшчэнне БНР.

Да канца лютага 1918 г. нямецкія войскі захапілі большую частку Беларусі да лініі Расоны -- Полацк -- Сянно -- Орша -- Магілёў -- Жлобін – Навазыбкаў. **3 сакавіка 1918 г.** паміж Савецкай Расіяй і Германіяй быў падпісаны сепаратны мірны дагавор, згодна з якім прыкладна 85% этнічнай беларускай тэрыторыі адыходзіла Германіі, 15% -- Савецкай Расіі. Для беларускіх зямель фактычнае спыненне стану вайны доўжылася да лістапада 1918 г.

Афармленне ідэі стварэння БНР (Беларускай Народнай Рэспублікі) звязана з устаўнымі граматамі. Першая грамата была падпісана 21 лютага 1918 г. Падпісанне Брэсцкага міру падштурхнула Выканаўчы камітэт Рады да выдання 9 сакавіка 1918 г. другой Устаўной граматы. Гэтым дакументам, «у межах рассялення і лічбавай перавагі беларускага народа», зацвярджалася назва краіны: Беларуская Народная Рэспубліка. Меркавалася, што асноўныя законы зацвердзіць Устаноўчы Сойм, што будзе скліканы на асновах агульнага, роўнага, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права. Пацвярджаліся дэмакратычныя свабоды, 8-гадзінны працоўны дзень, адмена прыватнай уласнасці на зямлю.

У трэццяй устаўной грамаце абвяшчалася незалежнасць БНР, яна была падпісана 25 сакавіка 1918 г. Аднак БНР не стала паўнавартаснай дзяржавай, яна не мела рэальнай незалежнасці. **Тэрыторыя, на якой дэкларавалася ўлада Рады БНР, кантралявалася нямецкімі акупацыйнымі войскамі і савецкай Расіяй.**

Дзейсных органаў кіравання на месцах ўрадам БНР створана не было. Можна канстатаваць, што адносіны былі ў лепшым выпадку абыякавымі. Усе намаганні кабінета Я. Варонкі былі накіраваны на здабыццё палітычнай падтрымкі з боку нямецкай адміністрацыі ў Берліне. Яму верылася, што Германія, якая падтрымала ўзнікненне Украінскай Народнай Рэспублікі і Літоўскай Рэспублікі, прызнае і ўрад БНР. Але Германія з

Савецкай Расіяй заключылі дамову аб непрызнанні Берлінам новых дзяржаўных утварэнняў, якія паўстануць на тэрыторыі Расіі пасля 3 сакавіка 1918 года. На ноты ўраду Я. Варонкі канцлер Рэйха Георг фон Хертлінг заявіў, што Берлін ставіцца да Беларусі як да часткі Савецкай Расіі. Больш таго, перамовы з нямецкім урадам і стасункі з акупацыйнымі войскамі толькі кампраметавалі БНР. У германскіх войсках беларусы бачылі прыгнятальнікаў і ворагаў, якія неслі голад і разбурэнні.

Адмова савецкага кіраўніцтва ад прызнання Беларускай Народнай Рэспублікі ставіла пытанне аб суб'ектнасці БНР. У такіх умовах з'явілася Трэцяя Устаўная грамата. Яна ўпершыню аб'яўляла Беларусь незалежнай дзяржавай. Задача прызнання незалежнасці на міжнароднай арэне вызначалася як самая галоўная для яе стваральнікаў. Аднак з пункту гледжання Германіі гэта дэкларацыя, якая падкрэслівала незалежнасць ад Расіі, нічога не змяняла. Крокам адчаю з'явілася тэлеграма да імператара Германіі Вільгельма II з падзякай за вызваленне Беларусі ад панавання Расіі і з чарговай просьбай аб падтрымцы БНР як дзяржавы, якую 26 красавіка 1918 г. падпісалі Р. Скірмунт, Я. Варонка і шэраг членаў Рады БНР. Гэты крок быў вельмі негатыўна ўспрыняты левым крылом Беларускай Сацыялістычнай Грамады і прывёў да яе расколу. БСГ распалася на тры партыі: Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю, Беларускую партыю сацыял-рэвалюцыянераў і Беларускую партыю сацыялістаў- федэралістаў. Апошнія выказалі незадаволенасць тым, што Р. Скірмунт палітычным партнёрам бачыў Польшчу, а не Расію.

Дататковым фактарам палітычнага крызісу Рады БНР летам і восенню 1918 г. з'явілася пашырэнне партызанскай барацьбы супраць нямецкіх акупацыйных войскаў. Паводле няпоўных звестак, на акупіраванай тэрыторыі Беларусі дзейнічала каля 100 партызанскіх атрадаў. Не змог вырашыць задачу міжнароднага прызнання і змяніўшы Р. Скірмунта на пасадзе кіраўніка Народнага сакратарыята сацыял-федэраліст Іван Серада. Без поспеху вярнулася дэлегацыя, накіраваная ў Кіеў у верасні 1918 г. пад кіраўніцтвам А. Луцкевіча, якая павінна была прывесці да прызнання БНР украінскай дзяржавай. Вельмі складанымі для перамоў былі пытанні аб дзяржаўнай мяжы. На перамовах з Савецкай Расіяй А. Луцкевіч, не адмаўляючы федэрацыі з Савецкай Расіяй, паставіў умову папярэдняга прызнання ўрада БНР. Перайменаванне Народнага сакратарыята ў Раду народных міністраў А.Луцкевіча і новыя спробы наладзіць перамовы з Расіяй адбываліся ва ўмовах нарастання рэвалюцыйных падзей у Германіі. Урад У. Леніна ў жніўні 1918 г. скасаваў усе папярэднія дамоўленасці з Германіяй. Прызнанне БНР ставіла б пытанне аб далейшым руху Чырвонай Арміі на ўсход ва ўмовах росту спадзяванняў на сусветную пралетарскую рэвалюцыю.

10 снежня 1918 г. войскі Чырвонай Арміі ўступілі ў Мінск. Да сярэдзіны лютага 1919 г. лінія фронту замацавалася на лініі Вільня–Ліда–Слонім–Бяроза-Картузская. У студзені распачала працу мірная канферэнцыя ў Парыжы. Аднак спробы А. Луцкевіча атрымаць падтрымку краін Антанты

поспеху не мелі. Напрыканцы лютага 1919 г. германскія войскі пакінулі Гродзеншчыну. Згодна з беластоцкай умовай, на гэтыя тэрыторыі ўвайшлі польскія войскі. У красавіку яны занялі Вільню, а ў жніўні – Мінск. Лёс Беларусі па-ранейшаму залежаў ад акупацыйных улад. Пры гэтым польская адміністрацыя не хацела пагаджацца нават з некаторымі здабыткамі ў нацыянальна-культурнай сферы: дзейнасцю беларускіх гімназій і школ, спробамі адкрыцця беларускай кансерваторыі і ўніверсітэта, пашырэннем беларускага перыядычнага друку і сферы ўжывання беларускай мовы. У такіх умовах дзейнасць урада БНР захоўвала толькі фармальнае значэнне. Ініцыятыва ў барацьбе за беларускую дзяржаўнасць перайшла да той часткі дэлегатаў Усебеларускага з’езду, якія захавалі спадзяванні на супрацоўніцтва і трывалыя кантакты з урадам Савецкай Расіі.

**3. Белнацкам и яго роля ў стварэнні ССРБ.** Пасля разгону Усебеларускага з’езда адбываецца паскарэнне бальшавізацыі левага крыла беларускага нацыянал-дэмакратычнага руху. На савецкай тэрыторыі беларуская нацыянальная ідэя была распаўсюджана сярод беларусаў-бежанцаў і тых, хто даўно жыў і працаваў у расійскіх губернях, сярод салдат.

31 студзеня 1918 г. У. Леніным быў падпісаны дэкрэт, у адпаведнасці з якім ствараўся Беларускі нацыянальны камісарыят на правах аддзела Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей РСФСР. Камісарам Белнацкама да мая 1918 г. з’яўляўся Аляксандр Чарвякоў (пасля Іван Лагун), а яго намеснікам левы эсэр Удадзімір Скарынка. Белнацкам меў аддззяленні ў Петраградзе, Віцебску, Саратаве і Смаленску. З 1 сакавіка 1918 г. пачаў выходзіць друкаваны орган Беларускага нацыянальнага камісарыята газета «Дзянніца», яе рэдактарамі быў пісьменнік Зміцер Жылуновіч (Цішка Гартны). Фактычна Белнацкам і яго мясцовыя аддзяленні былі адзінымі ўстановамі, якія займаліся праблемамі бежанцаў.

Белнацкам вёў палітычную і асветніцкую працу сярод беларусаў на тэрыторыі Савецкай Расіі, клапаціўся пра бежанцаў, беларускія арганізацыі і ўстановы, якія былі эвакуіраваны падчас Першай сусветнай вайны. Ён займаўся адкрыццём беларускіх школ і клубаў, выдаваў літаратуру на беларускай і рускай мовах. Пад уплывам гэтай арганізацыі ідэя беларускай савецкай рэспублікі набывала ўсё большую падтрымку.

Найбольш паспяховай з’яўлялася праца Белнацкама сярод бежанцаў, у асяроддзі якіх беларуская ідэя развівалася больш паспяхова.

У ліпені 1918 г. у Маскве па ініцыятыве Белнацкама быў скліканы Усерасійскі з’езд

бежанцаў з Беларусі, які выказаўся за вольную адзіную рабоча-сялянскую Беларусь у цесным брацкім яднанні з Расійскай Савецкай Рэспублікай. Праз месяц, у жніўні 1918 г. у Петраградзе па ініцыятыве гарадскога аддзялення Белнацкама была склікана першая канферэнцыя беларускіх савецкіх арганізацый і партій.

У газеце «Дзянніца» быў апублікаваны артыкул З. Жылуновіча пад назвай «Як жа з Беларуссю», у якім выказваліся папрокі ў адрас Наркамнаца РСФСР на чале з І.В. Сталіным і кіраўніцтва Заходняй камуны аб ігнараванні інтарэсаў беларускага народа. Маскоўскі камітэт беларускіх секцый РКП(б), друкаваным органам якога таксама з'яўлялася «Дзянніца», 27 лістапада 1918 г. выразна выказаўся за абвяшчэнне Беларускай рэспублікі.

На канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б), што адбылася ў Маскве 21–23 снежня, было прызнана неабходным стварыць Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі, абраць Цэнтральнае бюро беларускіх секцый РКП(б) з ліку прыхільнікаў тэрміновага стварэння беларускай дзяржаўнасці ў складзе пяці чалавек на чале з З. Жылуновічам. У далейшым Цэнтральнаму бюро даручалася склікаць пасля VI Паўночна-Заходняй канферэнцыі Усебеларускі з'езд камуністаў і стварыць нацыянальны партыйны цэнтр. Прынятыя канферэнцыяй дакументы фактычна паставілі ЦК РКП(б) перад неабходнасцю тэрмінова вырашыць праблему беларускай дзяржаўнасці.

30 снежня 1918 г. ў Смаленску пачала працу VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б). У даклад старшыні Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) А. Мяснікова па пытанні «Бягучы момант» быў уключаны пункт «Беларуская Савецкая Рэспубліка». Ён змяшчаў прапанову «абвясціць Заходнюю Камуну самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Беларускай Рэспублікай». Дэлегаты пагадзіліся з такой прапановай і без абмеркавання амаль адзінагалосна прынялі яе. У пастанове аб тэрыторыі рэспублікі асноўным ядром яе лічыліся Мінская, Смаленская, Магілёўская, Віцебская і Гродзенская губерні з прылеглымі да іх мясцовасцямі суседніх губерняў, населеных пераважна беларусамі.

Канферэнцыя аб'явіла сябе *Першым з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі -- КП(б)Б.* **1 студзеня 1919 г.** быў абнародаваны «Маніфест Часовага Работніча-Сялянскага Ураду Беларусі», які быў напісаны Зміцерам Жылуновічам. 5 студзеня 1919 г. Часовы ўрад ССCР пераехаў ў Мінск. Для канчатковага завяршэння працэсу дзяржаўнага будаўніцтва было вырашана склікаць Усебеларускі з'езд саветаў.

Абвяшчэнне савецкай беларускай дзяржаўнасці мела выключнае значэнне. З'явілася жыццяздольная аснова пабудовы нацыянальнай дзяржавы. Дзякуючы настойлівым намаганням беларускіх нацыянальных колаў, якія арыентаваліся на бальшавікоў і падтрымлівалі савецкую ўладу, кіраўніцтва апошняй было вымушана пайсці на абвяшчэнне савецкай

рэспублікі на тэрыторыі Беларусі.

*Стварэнне ЛітБел ССР.*

Адбывалася падрыхтоўка да I Усебеларускага з'езда саветаў. Ён адбыўся 2–3 лютага 1919 г. З'езд прыняў Канстытуцыю рэспублікі, дэкларацыю аб устанаўленні федэратыўных сувязей з РСФСР, а таксама рашэнне аб аб'яднанні сацыялістычных Рэспублік Беларусі і Літвы ў адну дзяржаву.

**27 лютага 1919 г.** у Вільні на аб'яднаным пасяджэнні ЦВК Літоўскай і Беларускай рэспублік прынята рашэнне аб аб'яднанні рэспублік і стварэнні ўрада. Савет Народных Камісараў Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (ЛітБел) узначаліў адзін з арганізатараў Кампартыі Літвы В. Міцкявічус-Капсукас.

Новае дзяржаўнае ўтварэнне так і не змагло прыступіць да рэалізацыі праграм сацыяльна-палітычнага развіцця. У лютым 1919 г. Урад ЛітБел ССР спрабаваў спыніць польскую агрэсію на літоўска-беларускія землі, звяртаўся «да ўсіх народаў, усіх урадаў» з заклікам мірнага вырашэння спрэчных тэрытарыяльных пытанняў.

У сувязі з захопам большай часткі тэрыторыі Літоўска-Беларускай Рэспублікі У ліпені 1919 г. на пасяджэнні ЦК КП(б)ЛіБ было прынята рашэнне аб ліквідацыі Савета абароны ЛітБела, спыненні работы СНК, і ўрад ЛітБела афіцыйна завяршыў сваю дзейнасць.

**4. Польска-савецкая выйна і другое абвяшчэнне БССР.**

У лістападзе 1918 г. у Варшаве было абвешчана аб адраджэнні Рэчы Паспалітай. Ю. Пілсудскі заявіў аб аднаўленні дзяржавы ў межах 1772 г. Кіраўніцтва Рэчы Паспалітай не абмежавалася этнічнымі польскімі землямі. Польскі сейм заявіў, што «бацькаўшчына Касцюшкі, Міцкевіча і Траўгута належыць да Польшчы, як частка непадзельная». Ужо ў снежні 1918 г. польская армія заняла Аўгустоўскі, Бельскі паветы. Першыя баі з падраздзяленнямі Чырвонай Арміі адбыліся ў студзені 1919 г. У лютым 1919 г. паўночная група польскіх войскаў заняла большую частку Гродзенскай губерні.

16 лютага 1919 г. ЦВК Беларускай рэспублікі і Часовы рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад Літвы звярнуліся да польскага ўрада з прапановай мірнага вырашэння «спрэчных тэрытарыяльных пытанняў». Аднак гэты зварот застаўся без адказу. Польскім сеймам былі адхілены прапановы Савецкай Расіі аб правядзенні плебісцыту на памежных спрэчных тэрыторыях. У красавіку польскімі войскамі былі захоплены Слонім, Вільня, Пінск, Баранавічы.

Дыпламатыя не спрацавала. 8 красавіка ЦВК Літоўска-Беларускай ССР уводзіць у рэспубліцы ваеннае становішча. Была праведзена мабілізацыя ў Чырвоную Армію. 1 чэрвеня 1919 г.быў прыняты Дэкрэт УЦВК РСФСР аб ваенна-палітычным адзінстве Украіны, Латвіі, Літвы і Беларусі на чале з савецкай Расіяй.

Заходні фронт быў умацаваны. Аднак летам польскія войскі перайшлі ў

наступленне. Была занята Вілейка, потым Маладзечна, Лунінец. 8 жніўня 1919 г. польскія войскі захапілі Мінск, у жніўні-верасні занялі Бабруйск, Барысаў, Жлобін, Рагачоў. Толькі ў кастрычніку іх наступленне было спынена.

На захопленых тэрыторыях Польскі ўрад стварыў Грамадзянскае кіраўніцтва ўсходніх зямель. Беларусь была падзелена на тры акругі (Віленскую, Брэсцкую, Мінскую), якія ў сваю чаргу дзяліліся на паветы. Было адноўлена памешчыцкае землеўладанне.

Польскі рэжым выклікаў рост апазіцыйных настрояў сярод беларускіх палітычных партый і насельніцтва. На захопленай тэрыторыі Беларусі дзейнічала дзесяткі нелегальных партыйных камітэтаў, партызанскіх атрадаў. Акрамя бальшавікоў актыўна ўключылася ў партызанскую барацьбу партыя Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р), якая мела значны ўплыў у Гродзенскай, Віленскай, Мінскай губернях і з’яўлялася найбольш масавай палітычнай арганізацыяй.

На з’ездзе ў Вільні прадстаўнікі беларускай грамадскасці Віленшчыны і Гарадзеншчыны (9–10 чэрвеня 1919 г.) выказаліся за суверэннасць і непадзельнасць Беларусі. Аднак беларускі нацыянальны рух не змог выпрацаваць адзіную пазіцыю ў адносінах да польскіх улад. 19 чэрвеня ў час знаходжання ў Мінску Юзэф Пілсудскі прыняў дэлегацыю беларускіх дзеячаў на чале са старшынёй Рады БНР Язэпам Лёсікам. Пілсудскі заверыў, што ён з’яўляецца «прыхільнікам беларускай справы». Але ў выніку Начальнік польскай дзяржавы не прызнаў беларускую дзяржаўнасць. У снежні 1919 г. адбыўся раскол Рады БНР, частка яез членаў заявіла аб сваёй прапольскай арыентацыі, але большасць выказалася супраць саюзу з Польшчай. Яны абвясцілі Народную раду БНР на чале з Пятром Крачэўскім і стварылі новы ўрад на чале з Вацлавам Ластоўскім. Польскія ўлады не прызналі Народную раду і. арыштавалі В. Ластоўскага.

Вясной 1920 г. адбыліся змены на польска-савецкім фронце. Польскія войскі пачалі наступленне на Палессі. Яны захапілі Мазыр, Калінкавічы. На аснове распрацаванага плана ваенных дзеянняў ў сярэдзіне мая пачалося наступленне Заходняга фронту ў Беларусі. 11 ліпеня быў вызвалены Мінск, 14 ліпеня – Вільна, 19 ліпеня – Гродна, 1 жніўня – Брэст. Была рэальная магчымасць аднаўлення беларускай дзяржаўнасці. Аднак савецкае кіраўніцтва ў Маскве вырашала іншую задачу – правесці «саветызацыю Літвы і Польшчы».

12 ліпеня 1920 г. быў падпісаны мірны дагавор паміж Літвой і РСФСР, згодна з якім значная частка беларускай тэрыторыі Гродзеншчыны і Віленшчыны (з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, Вільна) прызнана часткай Літвы. Дагавор гарантаваў нейтралітэт Літвы ў ходзе савецка-польскай вайны.

Летам 1920 г. Чырвоная Армія правяла паспяховае наступленне на Варшаву і Львоў. Савецкі ўрад не прыняў да ўвагі ноту міністра замежных спраў Англіі Керзона (11 ліпеня 1920 г.) аб спыненні баявых дзеянняў на лініі Гродна – Брэст – Карпаты. У пачатку жніўня Чырвоная Армія вяла баі ўжо

на тэрыторыі Польшчы. Гэта выклікала магутны нацыянальна-патрыятычны ўздым у Польшчы, спрыяла пашырэнню ваеннай, фінансавай дапамогі еўрапейскіх урадаў. Як паведамляла газета «Дэйлі тэлеграф», дапамога была аказана італьянцамі, амерыканцамі, некаторымі нейтральнымі дзяржавамі. Англічане далі грошы, машыны, неабходны персанал. У справе рэарганізацыі арміі асноўная роля была адведзена французам.

Польскае камандаванне 14–16 жніўня 1920 г. флангавым ударам стварыла пагрозу акружэння Варшаўскай групоўкі савецкіх войскаў. Чырвоная Армія пачала паспешлівае адступленне, несучы вялкія страты. 21 жніўня польская армія заняла Брэст. Пачаліся перагаворы аб заключэнні перамір'я, якія вяліся ў Мінску, а затым былі перанесены ў Рыгу.

Мінск быў вызвалены ад польскіх войскаў у ліпені 1920 г. Для падрыхтоўкі дэкларацыі аб абвяшчэнні беларускай дзяржаўнасці была створана камісія. У яе склад увайшлі 4 прадстаўнікі партыі беларускіх эсэраў (Я. Бялькевіч, П. Берднік, І. Мамонька, М. Пашковіч), 2 – ад ЦК КП(б)Б (А. Чарвякоў, В. Кнорын), ад Беларускай камуністычнай арганізацыі – У. Ігнатоўскі, ад Бунда – А. Вайнштэйн. Урачыстае абвяшчэнне ССРБ адбылося 31 ліпеня 1920 г. у памяшканні гарадскога тэатра. Беларуская рэспубліка абвяшчалася, але толькі ў межах Бабруйскага, Барысаўскага, Ігуменскага, Мінскага, Слуцкага і Мазырскага паветаў. Таму дэкларацыю аб незалежнасці ССРБ не падпісалі прадстаўнікі БПС-Р, якія патрабавалі незалежнасці ССРБ у межах этнічнага самавызначэння.

*Падпісанне Рыжскага мірнага дагавора і яго наступствы для беларускай дзяржаўнасці.*

Жнівеньскія падзеі 1920 г. на польска-савецкім фронце падштурхнулі ваюючыя бакі да пачатку мірных перамоў. Такія перамовы пачаліся 17 жніўня 1920 г. у Мінску. Умовы былі неспрыяльнымі для савецкай дэлегацыі. Польскія войскі 16 жніўня перайшлі ў контрнаступленне і 21 жніўня занялі Брэст. Савецкая дэлегацыя настойвала на правядзенні савецка-польскай мяжы ў адпаведнасці з «лініяй Керзана».

Перагаворы з польскім бокам вяла расійска-ўкраінская дэлегацыя. Перамовы дэлегацыі савецкай Расіі з дыпламатамі Польшчы ішлі на працягу 5 месяцаў і толькі **18 сакавіка 1921 г.** у Рызе быў падпісаны мірны дагавор. Да Польшчы адышла амаль палова беларускай тэрыторыі (Гродзенская губерня, Навагрудскі, Пінскі, частка Слуцкага, Мазырскага і Мінскага паветаў Мінскай губерні, Лідскі, Ашмянскі, Дзіснянскі паветы Віленскай губерні, што складала 98,815 тыс. км$^2$ з насельніцтвам 3, 171 млн чалавек). Беларусы складалі большасць насельніцтва Заходняй Беларусі, аднак на дзяржаўным узроўні беларусаў кваліфікавалі нацыянальным меншасцю, не прызнавалі іх права на самавызначэнне.

Гэтыя тэрыторыі разам з Вільняй і бліжэйшымі ўсходнімі паветамі Літвы, захопленымі Польшчай яшчэ ў 1920 г., атрымалі неафіцыйную назву "Заходняя Беларусь", альбо "крэсы усходнія". Апорай польскай улады на захопленай тэрыторыі павінны былі стаць асаднікі – ваенныя каланісты з ліку былых удзельнікаў савецка-польскай вайны 1919–1920 гг.

Закладзеныя ў Канстытуцыі Польшчы 1921 г. дэмакратычныя правы і свабоды так і не атрымалі рэальнага ўвасаблення ў жыццё ва ўмовах узмацнення аўтарытарнага рэжыму "санацыі". У 1934 г. быў створаны канцэнтрацыйны лагер у Бярозе-Картузскай (цяпер г. Бяроза Брэсцкай вобласці), дзе да 1939 г. утрымліваліся абвінавачаныя ў «антыдзяржаўнай дзейнасці» праціўнікі ўлады. У пошуках лепшай долі беларусы (паводле розных падлікаў, ад 120 да 150 тыс. чалавек.) эмігравалі у Заходнюю Еўропу, ЗША, Канаду, краіны Лацінскай Амерыкі.

Заходняя Беларусь хутка была пераўтворана ў сыравінны прыдатак Польшчы. Прымусовы характар эканамічных і сельскагаспадарчых рэформ стварыў у грамадстве канфліктнае адчуванне, беларускае насельніцтва бачыла дыскрымінацыйнае стаўленне з боку польскіх улад.

Хутка стала зразумела, што заявы і дэкларацыі палякаў разыходзяцца з рэчаіснасцю. Юрыдычна, на паперы, нацыянальныя меншасці ў Другой Рэчы Паспалітай мелі шырокія правы, а на самой справе беларусы адчувалі палітычную, эканамічную і культурную дыскрымінацыю. У Заходняй Беларусі сярэдні заробак на заводах і фабрыках быў ніжэйшым, чым на этнічна польскіх землях, а працягласць працоўнага дня складала 10-11 гадзін. У выніку аграрнай рэформы беларускія сяляне згубілі агульныя абшчынныя ўчасткі зямлі, рэзка павялічылася колькасць збяднелых сялян у ваяводствах гэтак званых “усходніх крэсаў”.

Пасля Рыжскага міру міжваенная Польшча стала краінай з надта высокім працэнтам нацыянальных меншасцей. Каб вырашыць сваё нацыянальнае пытанне, польскі дзяржаўны эміграцыйны апарат распрацаваў комплекс мер па актыўнаму перасяленню беларусаў, украінцаў і яўрэяў у іншыя краіны свету. Арганізацыя эміграцыйнай хвалі беларускага насельніцтва дазваляла ўладам у Заходняй Беларусі эфектыўна ажыццяўляць палітыку апалячвання.

Рыжскі мірны дагавор падзяліў беларускі народ на дзве часткі, ён быў несправядлівым для беларускага насельніцтва. Толькі 17 верасня 1939 г. пачынаецца ўз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР, калі Чырвоная армія перайшла мяжу і пачала далучаць беларускія землі да Савецкай Беларусі.

1939 год з’явіўся годам значнага тэрытарыяльнага павелічэння БССР, бо адбылося гістарычнае *ўз’яднанне беларускага народа ў складзе адной дзяржавы.* У выніку тэрыторыя БССР павялічылася болей чым на 100 тыс. кв. км, а колькасць насельніцтва ўзрасла да 10 млн. чал.

***У беларускім грамадстве з’явілася новае свята, якое прымушае нас узгадаць факты з навейшай гісторыі Бацькаўшчыны. Дзень народнага адзінства падкрэслівае важнасць для беларусаў даты ўз’ядання Заходняй Беларусі і БССР – 17 верасня 1939 г.***

Аналізуючы гістарычныя факты, становіцца зразумела, чаму 17 верасня 1939 г. беларускае насельніцтва з кветкамі сустракала Чырвоную армію, якая перайшла мяжу з Заходняй Беларуссю. Шмат у якіх гарадах сёння існуе вуліца,

названая ў гонар гэтай даты. Уз’яднанне беларускага народа ў 1939 г. – гэта цудоўны факт айчыннай гісторыі, які прымушае нас у XXI стагоддзі працягнуць ідэю адзінства.

## 5. Фарміраванне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР).

Саюзы на тэрыторыі былой Расійскай імперыі мелі розныя ступені паглыблення – ад рысаў самастойнасці да унітарнай дзяржавы. Па гэтых прычынах паміж кіраўніцтвам рэспублік неаднаразова ўзнікалі вострыя рознагалоссі. Кіраўніцтва Расійскай кампартыі стварыла камісію, каб пакласці канец гэтым канфліктам. Узначаліў яе Валерый Куйбышаў, але найбольш актыўная роля ў ёй належала Іосіфу Сталіну, які яшчэ з моманту стварэння першага савецкага ўрада ўзначальваў наркамат па справах нацыянальнасцей, да таго ж за ім яшчэ з дарэвалюцыйных часоў замацаваўся аўтарытэт спецыяліста па нацыянальным пытанні. Менавіта яго праект новага дзяржаўнага аб’яднання савецкіх рэспублік быў пакладзены у аснову рашэння Камісіі Згодна гэтаму ***«плану аўтанамізацыі»*** было прапанова аб уваходжанне Украіны, Беларусі, Азербайджана, Грузіі і Арменіі ў РСФСР на правах аўтаномных рэспублік. Да гэтага часу фактычна органы РСФСР (З’езд Саветаў, УЦВК, СНК, наркаматы) набылі значэнне агульнафедэральных. Пры гэтым Расійская Федэрацыя змяняла сваю назву на СССР («Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік»).

Азнаёміўшыся з высновамі камісіі ЦК, меркаваннем І. Сталіна і пазіцыяй рэспублік і высветліўшы, што «аўтанамізацыю» не падтрымалі тры з шасці рэспублік (Грузія, Украіна і Беларусь), У. Ленін адхіліў яе і прапанаваў план дзяржаўнага саюза самастойных раўнапраўных рэспублік на аснове добраахвотнага і роўнага аб’яднання з агульнафедэральнымі органамі ўлады. Ён выступіў супраць празмернага цэнтралізму, за неабходнасць умацавання суверэнітэту і атрыбутаў незалежнасці кожнай рэспублікі, як абавязковай умовы аб’яднання народаў. Усім рэспублікам гарантаваліся роўныя правы ўнутры СССР і кожнай тэарэтычна давалася права свабоднага выхаду з Саюза.

Пастановай Пленума ЦК РКП(б) аб форме аб’яднання незалежных савецкіх рэспублік прызнавалася неабходнасць заключэння дагавора паміж Украінай, Беларуссю, Федэрацыяй закаўказскіх рэспублік і РСФСР аб аб’яднанні іх у Саюз Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік.

І Усесаюзны З’езд Саветаў адбыўся **30 снежня 1922 г.** у Маскве. Колькасны склад дэлегацый ад рэспублік вызначаўся прапарцыянальна колькасці іх насельніцтва. На І з’ездзе саветаў прадстаўнікамі РСФСР, Украінскай і Беларускай савецкіх сацыялістычных рэспублік, а таксама Закаўказскай федэрацыі (у якую увайшлі Азербайджан, Грузія і Арменія) былі падпісаны *Дэкларацыя аб стварэнні СССР* і *Саюзны Дагавор*. Ад РСФСР гэтыя дакументы падпісаў М. Калінін, ад УССР — М. Фрунзе, Г. Пятроўскі, ад ЗСФСР — М. Цхакая, ад БССР — А. Чарвякоў.

У Дэкларацыі вызначаліся прычыны і прынцыпы аб'яднання. Саюзны дагавор складаўся з 26 пунктаў, у якіх вызначаліся асновы аб'яднання — кампетэнцыя Саюза ССР, структура органаў улады і кіравання, ўводзілася адзінае грамадзянства і да т.п. У кампетэнцыю саюзных органаў перадаваліся пытанні знешняй палітыкі, знешняга гандлю, фінансаў, абароны, шляхоў зносін, сувязі. Усё астатняе заставалася ў падпарадкаванні саюзных рэспублік. Вышэйшым органам краіны абвяшчаўся *Усесаюзны З'езд*

*Саветаў*, а ў перапынках паміж яго скліканнямі — *ЦВК СССР*, які складаўся з дзвюх палат: *Саюзнага Савета* і *Савета нацыянальнасцей*.

З'езд абраў Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР (ЦВК СССР), у які ўвайшлі прадстаўнікі ад усіх рэспублік. Старшынёй ЦВК быў абраны М. Калінін, сустаршынямі — Г. Пятроўскі (ад УССР) Н. Нарыманаў (ад ЗСФСР), А. Чарвякоў (ад БССР). Быў сфарміраваны ўрад — *Саўнаркам СССР* – на чале з У. Леніным. Так на заключным этапе развіцця супрацоўніцтва савецкіх рэспублік (другая палова 1922 г.) адбылося іх непасрэднае аб'яднанне ў адзіную саюзную дзяржаву. Ваенна-гаспадарчы і дыпламатычны саюз рэспублік быў дапоўнены саюзам палітычным.

Падпісанне Саюзнай дамовы і фарміраванне агульных межаў Саюзнай дзяржавы давалі спадзяванні на вяртанне ўсходнебеларускіх тэрыторый у склад БССР. VII з'езд Кампартыі Беларусі, які адбыўся ў сакавіку 1923 г., паставіў пытанне аб узбуйненні рэспублікі. ЦВК БССР таксама заявіў, што «праектаванне адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення не можа быць выканана ў межах тэрыторыі сучаснай Беларусі без змянення яе ўсходніх межаў». *Першае ўзбуйненне БССР* адбылося *ў сакавіку 1924 г.* У яго выніку ў склад рэспублікі ўвайшлі паветы Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, у якіх пераважала беларускае насельніцтва. У сувязі з першым узбуйненнем тэрыторыі Беларусі ў 1924 г.кіраўніцтва БССР па прапанове А. Смоліча правяло новае раянаванне БССР.

У канцы **1926 г.** завяршыўся працэс вяртання усходнебеларускіх зямель у склад БССР (другое ўзбуйненне БССР). Пастановай ЦВК БССР ад 8 снежня 1926 г. Гомельскі і Рэчыцкі паветы Гомельскай губерні ў іх адміністрацыйных межах з гарадамі Гомель і Рэчыца сталі часткай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Напачатку у Гомельскім і Рэчыцкім паветах захоўваліся ранейшыя адміністрацыйныя межы валасцей і сельсаветаў – паветы былі названыя акругамі, а валасці-раёнамі. Яны істотна саступалі па тэрыторыі і насельніцтву адпаведным на той час адміністрацыйным адзінкам БССР. Гэта падштурхнула да змен у адміністрацыйна- тэрытарыяльным дзяленні БССР